# АДНАЎЛЕННЕ І ЛІКВІДАЦЫЯ СУРАЖСКАГА ПАВЕТА ВІЦЕБСКАЙ ГУБЕРНІ Ў 1919–1922 гг.

***Бараноўскі А.В.,***
*аспірант Інстытута гісторыі НАН Беларусі, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*Навуковы кіраўнік – Траццяк С.А., канд. гіст. навук*

Зменам адміністрацыйна-тэрытарыяльнага дзялення ў гістарычнай навуцы надаецца недастатковая ўвага. Гэта пры тым, што кожны даследчык, які пачынае займацца той ці іншай праблемай падчас лакалізацыі свайго аб'екта даследавання, немінуча сутыкаецца з адміністрацыйна-тэрытарыяльным дзяленнем тэрыторыі, якую вывучае. Тэрытарыяльнае ўладкаванне Віцебшчыны на лакальным узроўні амаль не даследавана.

Мэтай нашага даследавання з'яўляецца на падставе архіўных дакументаў прасачыць, як адбываўся аднаўленне і ліквідацыя Суражскага павета Віцебскай губерні ў 1919–1922 гг.

**Матэрыял і метады.** У працэсе даследавання былі выкарыстаны матэрыялы з фондаў Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці і Дзяржаўнага архіва Расійскай Федэрацыі. Метадамі даследавання з'яўляюцца агульнанавуковыя і спецыяльна-гістарычныя метады: гісторыка-тыпалагічны і гісторыка-сістэмны.

**Вынікі і іх абмеркаванне**. У пачатку 1919 г. мясцовыя актывісты вырашылі аднавіць Суражскі павет, які існаваў у складзе Віцебскай губерні ў 1802–1866 гг. Упершыню гэтае пытанне абмяркоўвалася 6 лютага 1919 г. на пасяджэнні Суражскага гарвыканкама. Мясцовае кіраўніцтва лічыла неабходным аднавіць павет у ранейшых межах з цэнтрам у Суражы, прымаючы пад увагу наступныя абставіны: па-першае, Сураж раней з'яўляўся павятовым цэнтрам, аднак, "дзякуючы капрызам царскіх саноўнікаў", павет быў ліквідаваны без якіх-небудзь на тое эканамічных ці адміністрацыйных прычын; па-другое, паводле Канстытуцыі РСФСР, гарады, што маюць больш за 6000 жыхароў, маглі быць вылучаныя ў паветы; па-трэцяе, Сураж мае вельмі добрае геаграфічнае становішча, размешчаўся на берагах Дзвіны і знаходзіўся на скрыжаванні дарог, што вядуць на Віцебск, Гарадок і Парэчча. Пасля пасяджэння Суражскага гарвыканкама ў Віцебскі губвыканкам было накіравана хадайніцтва аб аднаўленні Суражскага павета [1, арк. 6].

Першапачаткова пытанне аб стварэнні Суражскага павета было разгледжана калегіяй аддзела кіравання Віцебскага губвыканкама. Яна ў сваю чаргу звярнулася да аддзелаў губвыканкама і Веліжскага, Віцебскага, Гарадоцкага павятовых выканкамаў з мэтай вызначыць іх стаўленне да гэтага пытання. Зямельны аддзел і аддзел дзяржаўнага кантролю губвыканкама адмоўна аднесліся да арганізацыі Суражскага павета, паколькі "прыйдзецца зрабіць вялікія выдаткі народных грошаў" [2]. Аднак, нягледзячы на гэта, Віцебскі губвыканкам 5 сакавіка 1919 г. зацвердзіў рашэнне аб арганізацыі павета [3, арк. 7]. 26 сакавіка агульны пададдзел аддзела кіравання губвыканкама інфармаваў губземадзел пра арганізацыю Суражскага павета. У яго склад увайшлі дзве воласці: Касплянская (Веліжскі павет) і Кашэвіцкая (Дзямідаўскі павет Смаленскай губерні). Была таксама атрымана згода на ўваходжанне ў склад павета Казакоўскай воласці Веліжскага павета [1, арк. 10 адв.]. Такім чынам, Суражскі павет быў адноўлены, але ў яго склад увайшлі толькі тры названыя воласці.

У далейшым Суражскі павет так і не быў узбуйнены. З'езды Саветаў Веляшковіцкай, Вымнянскай, Курынскай, Янавіцкай валасцей Віцебскага павета, а таксама Цёсцінскай воласці Гарадоцкага павета (усе гэтыя воласці раней уваходзілі ў склад Суражскага павета), не толькі выступілі супраць далучэння да Суражскага павета, але наогул супраць стварэння дадзенага павета [3, арк. 54–57]. У сувязі з гэтым 31 студзеня 1921 г. адбылося аб'яднанае пасяджэнне Суражскага павятовага выканкама і парткама, на якім абмяркоўваўся далейшы лёс павета: пашырэнне або расфармаванне. Старшыня павятовага выканкама Шэршнёў выказаўся так: "Сураж ўяўляе з сябе не горад, а брудную вёску". Падчас стварэння павета планаваўся ўваход у яго склад каля дзесяці валасцей, але далейшыя спробы пашырыць тэрыторыю павета засталіся безвыніковымі. Таму на пасяджэнні было вырашана прапанаваць Віцебскаму губвыканкаму два шляхі: альбо узбуйніць павет, альбо яго ліквідаваць. У першым выпадку да яго планавалася далучыць Янавіцкую, Вымнянскую і частку Курынскай валасцей Віцебскага павета; Цёсцінскую і Вярэцкую воласці Гарадоцкага павета; Вярхоўскую, Усвяцкую і частку Будніцкай валасцей



Репозиторий ВГУ

Веліжскага павета. У другім выпадку – Каспляньская валасць передавалася Віцебскаму павету, Казакоўская – Веліжскаму, Кашэвіцкая – Дзямідаўскаму павету Смаленскай губерні, а Сураж станавілася мястэчкам [4, арк. 7–8].

Далейшы лёс Суражскага павета вырашаўся 23 верасня 1921 г. на пасяджэнні губернскай адміністрацыйнай камісіі. Прысутныя палічылі мэтазгодным ліквідаваць павет у сувязі з неразвітасцю прамысловай вытворчасці і адсутнасцю будынкаў для размяшчэння павятовых устаноў [4, арк. 3]. 24 студзеня 1922 г. пленум Віцебскага губвыканкама прыняў пастанову: "Суражскі павет як няправільна ўзнікшую адміністрацыйную адзінку – ліквідаваць" [5, арк. 21]. Праз тры дні, на пасяджэнні адміністрацыйнай камісіі быў распрацаваны план ліквідацыі Суражскага павета. Згодна з ім павет цалкам далучаўся да Веліжскага павета. Каспляньская і Казакоўская валасці аб'ядноўваліся ў адну – Суражскую з валасным цэнтрам у мястэчку Сураж. Перадачу спраў і саму ліквідацыю планавалася скончыць да 15 лютага, а павет лічыць ліквідаваным з 1 лютага 1922 г. [6]. Адміністрацыйная камісія УЦВК, даведаўшыся пра ліквідацыю Суражскага павета, накіравала 3 мая 1922 г. ліст у губвыканкам з просьбай растлумачыць прычыны самавольнага расфарміравання павета, паколькі адміністрацыйныя змены не павінны былі адбывацца без санкцый УЦВК [4, арк. 2]. У сваім адказе адміністрацыйная камісія губвыканкама адзначыла, што Суражскі павет да яго ліквідацыі існаваў без зацвярджэння Цэнтра і такім чынам, яго ліквідацыя санкцыі УЦВК не патрабавала [5, арк. 20].

**Заключэнне.** Такім чынам, дзякуючы намаганням мясцовых актывістаў у сакавіку 1919 г. быў адноўлены Суражскі павет, аднак адміністрацыйна-тэрытарыяльныя змяненні не знайшлі падтрымку з боку насельніцтва і кіраўніцтва валасцей, што калісьці ўваходзілі ў склад павета. Па гэтай прычыне адноўлены павет быў зноў ліквідаваны ў лютым 1922 г. Пасля вяртання ў 1924 г. усходнебеларускіх тэрыторый у склад Беларускай рэспублікі Сураж стаў цэнтрам Суражскага раёна Віцебскай акругі, але тэрыторыя арганізаванага раёна і ліквідаванага павета значна адрознівалася.


1. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (далей – ДАВВ). – Ф. 14. Воп. 1. Спр. 191.
2. ДАВВ. – Ф. 1821. Воп. 1. Спр. 316. Арк. 26.
3. ДАВВ. – Ф. 2262. Воп. 1. Спр. 6.
4. ДАВВ. – Ф. 1821. Воп. 1. Спр. 637.
5. Дзяржаўны архіў Расійскай Федэрацыі (далей – ДАРФ). – Ф. 5677. Воп. 1. Спр. 34.
6. ДАВВ. – Ф. 1821. Воп. 1. Спр. 174. Арк. 2 – 2 адв.


## ГЕОИМИДЖИРОВАНИЕ ХАКАСИИ: ИЗУЧЕНИЕ В ИСТОРИЧЕСКОМ РАКУРСЕ


***Баранцева Е.А.,***

*студентка 4 курса ХГУ имени Н.Ф. Катанова, г. Абакан, Российская Федерация*

*Научный руководитель – Костякова Ю.Б., канд. ист. наук, доцент*


Средства массовой информации играют ведущую роль в формировании имиджа региона. Однако особенности участия СМИ в этом процессе до сих пор остаются недостаточно изученными. Кроме того, процесс формирования геоимиджа является не только политически, но и исторически обусловленным процессом. Поэтому рассматривать его необходимо и в исторической перспективе. Такой подход позволяет выявить основные приемы создания образа территории с помощью масс-медиа, а также факторы, которые влияют на данный процесс. Это определяет актуальность исследуемой нами темы.

Цель работы – выявить основные приемы формирования образа Хакасии в сибирских газетах 1931 г. в аспекте геоимиджирования.

**Материал и методы.** Материалом исследования послужили издания сибирских газет за 1931 г. «Советская Сибирь» и «Красноярский рабочий», посвященных Хакасии. Основными методами исследования выступают: контент-анализ и сравнительно-сопоставительный анализ.

**Результаты и их обсуждение.** В ходе анализа справочной литературы мы выяснили, что термины «образ» и «имидж» часто выступают как синонимичные. Однако «образ» можно назвать более универсальным и общим понятием, которое более применимо, когда речь идет о стихийном формировании образа территории в СМИ. В то время, как под «имиджем» чаще подразумевается целенаправленно сформированное представление о территории.

Репозиторий ВГУ